Савицкая М.В., студент 450 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Наровская А.Н.,
кандидат исторических наук, доцент

# РЭПРЗЭНТАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ СТРОЯЎ У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ МУЗЕІ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ

Беларускі народны касцюм быў сфарміраваны ў старажытныя часы, мае надзвычай высокую культурную каштоўнасць і з'яўляецца адным з этнічных атрыбутаў беларускага народа. У сувязі з працэсамі глабалізацыі колькасць народных касцюмаў ў традыцыйным грамадстве з кожным годам памяншаецца. Цікавасць да касцюма, а таксама лакальных і рэгіянальных асаблівасцей яго ўзрастае ў грамадстве, што і абумовіла ***актуальнасць тэмы даследавання***. Важную ролю па захаванні і трансляцыі культурнай спадчыны адыгрываюць музеі ў якіх захоўваюцца ўнікальныя музейныя прадметы, у тым ліку беларускія народныя строі.

***Мэта*** – адлюстраваць ролю Беларускага дзяржаўнага музея ў пытанні захавання і трансляцыі ўнікальнасці калекцый музея ў сучасным соцыуме.

Вялікі ўклад у даследаванне традыцыйнага касцюма беларусаў унеслі даследчыкі XIX ст. У гэты час з'яўляюцца першыя этнаграфічныя апісанні традыцыйнага жаночага і мужчынскага касцюма ў працах П. Бабро ўскага [1], М. Я. Нікіфароўскага [2], Е. Р. Раманава [3], І. А. Сербава [4] і інш. У XX-XXI стст. даследаваннем беларускага касцюма займаліся М. Ф. Раманюк, М. М. Віннікава, В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава [5].

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту адносіцца да тыпу музеяў пад адкрытым небам або музеяў-скансэнаў. Музеі гэтага тыпу – гэта адна з формаў захавання і паказу помнікаў гісторыі і культуры ў блізкім да натуральнага асяроддзі. Аснова экспазіцыйнай зоны — ўмоўны падзел тэрыторыі Беларусі на шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Цэнтральная

Беларусь, Падняпроўе, Паазер'е, Усходняе і Заходняе Палессе, Панямонне. На цяперашні час дзейнічаюць тры рэгёны Беларусі: цэнтральная Беларусь, Падняпроўе і Паазер'е.

Музей, які дэманструе народную, традыцыйную культуру краіны ў адзінстве яе рэгіянальных і лакальных асаблівасцей, Беларускі скансэн адносіцца да музеяў этнаграфічнага комплекснага профілю рэспубліканскага значэння. Беларускі скансэн адносна малады ў параўнанні з аналагічнымі музеямі свету. Ён быў адчынены ў 1976 г.

Музей захоўвае і дэманструе помнікі традыцыйнага народнага дойлідства пад адкрытым небам у натуральным прыродным асяроддзі. Беларускі скансэн валодает шматлікімі калекцыямі. Асобнае месца займае збор элементаў народнага адзення,які фарміраваўся на працягу 1977-2020 гг. і дэманструе народныя строі ўсіх рэгёнаў Беларусі.

Беларускі народны строй — комплекс адзення, які сфарміраваўся на беларускіх землях на працягу стагоддзяў і адрознівае беларусаў ад суседніх народаў, з’яўляецца часткай мясцовай і нацыянальнай ідэнтычнасці.

Жаночны строй складаецца з кашулі, спадніцы, фартуха, абутку і галаўнога ўбора. У залежнасці ад рэгёна да гэтага комплексу таксама дадаецца гарсэт альбо безрукаўка, пояс. Мужчынскі строй складаецца з нагавіц, кашулі, пояса, абутка і галаўнога ўбора. У некаторых рэгёнах прысутнічае камізэлька, шыйная хустка. Адрозніваюць мужчынскі і жаночы строй таксама характар упрыгожвання. Асноўнымі элементамі дэкору строя з’яўляюцца вышытыя альбо тканыя ўзоры, пераважна геаметрычныя. У кожным рэгёне былі свае асаблівасці адносна іх размяшчэння і характару.

Вытокі беларускага адзення дасягаюць у старажытныя часы. Умерана кантынэнтальны клімат, працяглая зіма і негарачае лета вымагалі закрытага, цёплага адзеньня. Фармаванне ўласна беларускага традыцыйнага строю і яго асаблівасцяў пачалося ў часы Сярэднявечча. Да канца XIX — пачатку XX ст. яго аблічча сфарміравалася, скаліся рэгіянальныя этнічныя асаблівасці. Адна з найважнейшых характарыстык беларускага строю — незвычайная

ўстойлівасць традыцыі. Убіраючы ў сябе разнастайныя павевы на працягу стагоддзяў, беларускі строй доўгі час захоўваў нязменным крой некаторых прадметаў адзення, яго форму, асобныя атрыбуты строю ўзыходзяць да старажытных часоў, у ім захаваліся архаічныя рысы, напрыклад, старадаўні арнамэнт і паласаты дэкор. Тэхналогіі вырабу тканін таксама захаваліся са старажытных часоў. Нягледзячы на ўстойлівасць традыцыйнага аблічча, гарнітур рознаварыянтны ў вобразнай і кампазыцыйнай праявах.

У беларускім нацыянальным строі выкарыстоўваліся толькі натуральныя тканіны, якія вырабляліся ў хатніх умовах, у асноўным гэта былі лён і воўна, таксама ўжывалася тканіна з валокнаў каноплі. Для афарбоўкі пражы выкарыстоўваліся натуральныя фарбавальнікі: настоі траў, кары, лісьця дрэў, балотнай руды. Для вырабу верхняй вопраткі ўжываліся сукно і аўчына.Чырвоныя ніткі для вышыўкі купляліся, але пасьля ўжо ў хатніх умовах дафарбоўваліся ў карычневы і бардовы колеры.

Часцей за ўсё адзенне было белага колеру, у якасьці ўпрыгожвання яно афармлялася вышытым чырвоным арнамэнтальным узорам, які аб’ядноўваў увесь камплект ў адзіную кампазыцыю. У арнаменце выкарыстоўваліся геамэтрычныя ўзоры, пазьней сталі прымяняцца таксама раслінныя ўзоры і іх спалучэньне з геамэтрычнымі.

У абавязковым парадку афармляліся арнамэнтам рукавы, каўнер, фартух і галаўныя ўборы. Таксама для афармленьня магло выкарыстоўвацца ткацтва ніткамі розных колераў.

Пры вырабе строю выкарыстоўваліся вышыўка, бранае, закладное, рамізнае, пераборнае і ўзорнае ткацтва, карункі і аплікацыя, існаваў таксама спецыфічны промысел упрыгожання тканін — набіванка. Для вырабу паяснога адзення шырока ўжываліся паліхромныя суконныя тканіны. На фартухі прышывалі пакупныя або самаробныя карункі.

Са з’яўленнем анілінавых фарбавальнікаў і крамных нітак спэктар колераў дапоўніўся аранжавым, фіялетавым, блакітным, малінавым, ярка-зялёным, аднак сфэра іх выкарыстання была абмежаванай. У беларускім строі

выкарыстоўваліся тры тыпы кашуль: з прамымі плечавымі ўстаўкамі, тунікападобная, з какеткай. Кашулі ўсіх тыпаў мелі прамы разрэз (пазуху) па цэнтры, даўжыня якога дасягала 35-40 см.

У старажытныя часы часцей за ўсё кашулі шылі бяз швоў на плячах, проста перагінаючы тканіну, але ў XIX стагоддзі такі крой лічыўся састарэлым і выкарыстоўваўся толькі ў абрадавай вопратцы. Крой стаў полікавым, пры якім пярэдняе і задняе палотнішчы злучаліся з дапамогай прастакутных уставак з таго ж самага матэрыялу — полікаў.

Каўнер прысутнічаў толькі ў святочнай вопратцы сялян, яго вышыня была каля 2-3 см. Сярод дробнай шляхты быў распаўсюджаны адкладны каўнер. Стаячы каўнер зашпіляўся на пару гузікаў збоку або спераду, адкладны — на запанкі (шпонку) або сцягваўся стужкай або палоскай каляровай тканіны. Пры раскроі спадніцы з палатна рабілі два палатны, а пры шыцці спадніцы з сукна выкарыстоўвалі ад трох да шасці падоўжных полак, якія сшывалі разам і збіраліся ў складкі каля пояса.

У 2021 г. у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту адкрылася экспазіцыя беларускіх строяў. Выстава праходзіла ў помніку архітэктуры Спаса-Праабражэнскай царкве (в. Барань” э/с “Падняпроўе”). На выставе былі прадстаўлены 17 жаночых і 10 мужчынскіх строяў 2-й паловы XIX – пачатку XX ст., якія прадстаўлялі народнае адзенне беларусаў, а таксама рэгіянальныя адрозненні ў аздабленні.

У вітрынах экспазіцыі былі прадстаўлены разнастайныя аксесуары: каптуры, хусткі, шалікі і паясы. Больш за сотню экспанатаў - усе аўтэнтычныя, якія доўгі час захоўваліся ў куфрах людзей. Найбольшы інтэрэс у экспазіцыі прадстаўляў жаночы строй Падняпроўя і Заходняга Палесся.

Такім чынам, у фондах Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту захоўваюцца ўнікальныя калекцыі народнага адзення шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, якія былі сабраны навуковымі супрацоўнікамі музея на працягу 1977-2020 гг. У экспазіцыі інтэр’ераў жылых

памяшканняў прадстаўлены альбо цэласныя строі альбо асобныя элементы касцюма (паясы, андаракі, спадніцы, намiткі і інш.). У 2021 г. у музеі была арганізавана выстава беларускіх аўтэнтычных строяў. Асаблівую цікавасць уяўлялі касцюмы Маларыцкага, Кобрынскага, Драгічынскага раёнаў Брэсцкай вобласці і ‘Хоцімскага, Касцюковіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці.

СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ

1.Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния : [в 2 ч.] / П. Бобровский. – СПб. : Тип. Департамента Генер. штаба, 1863. – Ч. 1 : Приложения. – 249 с.

2.Никифоровский, Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: этнографические данные: с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н. Я. Никифоровский. – Витебск, 1895. – VIII. – 552 с 3.Романов, Е. Р. Белорусский сборник : [в 9 вып.] / Е. Р. Романов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – VIII, 600 с.

4.Сербов, И. А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. / И. А. Сербов. – Вильна : Сев.-Зап. отд. Имп. Рус. геогр. о-ва, 1914. – 51 с.

5.Бялявіна, В. М. Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. Мінск:Беларусь, 2017. – 463 с.